Кастусь Тарасаў

# Памяць пра легенды

## Глосы да часоў Жыгімонта Старога

Глосай, у прамым значэнні гэтага грэчаскага слова, называецца памета на палях кнігі ці рукапісу, тлумачэнне незнаёмага паняцця, пэўная заўвага. Такое найменне ў данным канкрэтным выпадку ўжываецца з дастатковай умоўнасцю — бо чаго адзін не спасцігне ўсё жыццё, другі ведае з дзяцінства. Напрыклад, калі аўтар вучыўся ў школе, дык і словазлучэння гэткага не чуў — «гісторыя Беларусі», а зараз кожны школьнік трымае ў руках падручнік з такой назвай. Як ён на пісаны — добра ці блага — справа іншая. Але даўней і таго не мелі, і толькі ў сталым веку аўтар стаў цікавіцца роднай гісторыяй. Чытаючы гістарычныя выданні нашага часу — бо іншых у звычайных бібліятэках няма — меўся адзначаць тыя моман ты, якія нявольна ці наўмысна пададзены цьмяна, выклікалі, мякка кажучы, здзіўленне. Раней, ды яшчэ і сёння, многія перыяды нашага старажытнага і нядаўняга мінулага паказваюцца даследчыкамі так, што настойліва патрабуюць гласарыяў — слоўнікаў цяжказразумелых паняццяў ці акрэсленняў. Можна спадзявацца, што з цягам часу яны з'явяцца, а пакуль шырокія колы чы тачоў, да якіх аўтар залічвае і сябе, вымушаны самастойна, саматужна выпраўляць хібы і недаробкі школьнай асветы, адшукваць адказы на простыя пытанні з даўніны свайго краю ў мностве кніжак, каб хоць троху ад чуваць сябе культурнымі сярод людзей.

Ніжэй будзе моўле на крыху пра выдатнага еўрапейскага гуманіста, нашага вялікага асветніка, славутага Францыска Скарыну. Чаму крыху? Таму, што да 500-ых угодкаў з дня нараджэння беларускага першадрукара, якія

адзначаліся пад эгідай ЮНЕСКА ва ўсім культурньгм свеце, выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» падрыхтавала і выдала энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час». У ім апрача шматлікіх артыкулаў змешчаны фотаздымкі ўсіх прадмоў і пасляслоўяў Скарыны да ягоных выданняў. Адно ўжо гэта дае шырокае ўяўле нне пра асобу вядомага беларускага дзеяча. Падаецца таксама і вялікая колькасць мастацкага матэрыялу, скарыстанага ў кніжках, якія падараваў усходнім славянам Францыск Скарына. Даведнік усебакова асвятляе жьгццё і творчасць вучонага, пісьменніка, мастака, яго велічную постаць і вечнае значэнне кнігавыдавецкай дзейнасці для беларускай культуры і самасвядомасці беларусаў.

Але задаволіцца адной толькі спасылкай на энцыклапе дычнае выданне бьгло б няправільна, 6о Скарына моцна паўплываў на культуру XVI-XVII стагоддзяў, і некалькі момантаў, хоць ужо і агульнавядомых, пазначыць варта. Яго асветніцкая дзейнасць, поспехі і няўдачы з'явіліся вынікам пэўных абставін, у іх адлюстраваўся і стан грамадскай думкі, палітычнага, сацыяльнага быцця ў Вялікім княстве Літоўскім, і тагачасная ваенная сітуацыя. Усе людзі ў рэальным жыцці болын моцна звязаны адзін з другім, чым здаецца. «Люд паспаліты» залежыць ад тых, хто трымае ўладу, геній — ад згуртаваных цемрашалаў ці схаластаў, воля чалавека суадносіцца з законамі, якія яе абмяжоўваюць, часцяком з вялікай несправядлівасцю, і г. д. Кожны імкнецца да праўды, але заўсёды, нават у лепшыя часы, яе не хапае. Што ж можна мовіць пра благую гадзіну, калі святкуе крыўда?

Здаралася і такое , калі шмат што залежала ў нашай гісторыі ад колькасці сыноў вялікага князя. У Вітаўта іх не было, і Вітаўтавічы не займалі віленскі трон. Болын шчаслівы лёс у гэтых адносінах напаткаў Ягайлу, які заснаваў дынастыю. Ен меў, як памятаем, двух сыноў — Уладзіслава і Казіміра. Уладзіслаў загінуў у бітве. Смерць маладога караля прывяла да ўзнаўлення персанальнай уніі — польскія радныя паны абралі на каралеўскі трон Казіміра і такім учынкам выратавалі карысны для іх саюз Польшчы з Вялікім княствам Літоўскім.

У Казіміра, як і ў ягонага дзеда Альгерда і прадзеда Гедыміна, было 13 дзяцей — шэсць сыноў і сем дачок. Дзве дачкі памерлі ў немаўляцкім узросце, астатнія больш-менш удала выйшлі замуж за нямецкіх князёў. Першы сын Казіміра, Уладзіслаў,— з 1471 года — кароль чэшскі, з 1490 года — кароль венгерскі. Другі сын, Казімір, памёр, пражыўшы дваццаць пяць гадоў, нічога значнага зрабіць не паспеў. Трэці, Ян Ольбрахт, у 1492 годзе стаўся пераемнікам бацькі на польскім троне, на якім знаходзіўся па 1501 год — да сваёй смерці. Аляксандр, маладзейшы за брата на два гады, у 1492 годзе быў абраны вялікім князем літоўскім, а з 1501 па 1506 год з'яўляўся адначасна і каралём польскім. У 1467 годзе нарадзіўся Жыгімонт, які заступіў Аляксандра на кракаўскім і віленскім тронах. Малодшы сын Казіміра, Фрэдэрык, пайшоў па духоўнай лініі і ў 1493 годзе стаў кардыналам Польшчы. Казімір трымаў польскі трон амаль паўстагоддзя, а вялікім князем літоўскім прабыў пяцьдзесят два гады. Як кароль ён большы час мусіў жыць у Кракаве, і віленскі вялікакняжацкі пасад заставаўся па сутнасці пусты. Справы вырашала Рада Вялікага княства. Пры Казіміры пачалася паланізацыя Літвы і Беларусі. Сам ён не меў вялікай ахвоты да дзяржаўнага кіравання, больш па душы яму былі «рыцарскія заняткі», у першую чаргу — паляванне і ловы. Аднак менавіта пры ім Т эўтонскі ордэн канчаткова заняпаў і трапіў у залежнасць ад Польшчы. «Паляваў» Казімір і на ўсходніх межах. Вось як падаецца гэта ў «Летапісцы вялікіх князёў Літоўскіх»: «Тое ж пак зимы княз великии Казимер сам будучы у Смоленску послал воевод своих князеи и панов Литовских против того воевати Московское земли. И звоевали Козелеск, Верею, Калугу, Можаиско и много лиха вчынили Московскои земли и много людеи у полон повели у Литовскую землю. И Москвичы собравшыся за девать днеи погналися за Литвою и догонившы билися з Литвою. И помог Бог Литве, иж побили много Москвич Литва, и много живых поимали и прыве ли их к Смоленску ко князю великому Казимеру. И вчынили тогды князи и панове великую честь князю великому Казимеру королевичу. А Московского князя великого не было в тот час на Мо ско вско и зе м ли : хо ди л к Муро м лю битися с царем Махметем н з сыном его

Монтяком. И там тэж побили Москвич на голову, и самого князя Василя Московского, и Можаиского князя Ивана поимали, и иных князеи и бояр много побиши, а иных жывых поимали. А была им битва на Суздали у манастыра святого Спаса, и была тогда Москва у великом страху. А потом цар Махмет и сын его Монтяк дали князя великого Московского на окуп и взяли за него великое множество рублев н соболеи, и мир з Москвою в тот час взяли.

Того ж году князь великии Казимер з Московским перемире взял и прысягу промежку себе вчынили иж покою межы их землями быти».

І праўда, быў пакой да часу смерці Казіміра.

Да праваслаўнай царквы вялікі князь прыхільнасці не адчуваў і таму прыклаў намаганні, каб адбылася унія заходняй і ўсходняй цэркваў. Гэты саюз выклікаў незадаволе нне не толькі сярод праваслаўных святароў, але і сярод праваслаўных князёў і паноў. А прамым вынікам неадабрэння стала змова, якая мела мэтай забойства Казіміра. Князі Міхаіл Алелькавіч Слуцкі, Фёдар Іванавіч Бе льскі і Іван Юр'е віч Гальшанскі распрацавалі план замаху на жыццё караля і вялікага князя. Адпаведна плану замах намячаўся адбыцца 15 красавіка 1481 года на вяселлі Фёдара Бельскага з к н я з ё ўн а й Г а н н а й К о б р ын с к а й у Кобрынскім замку. Князі ўлічылі звычкі Казіміра і прадумалі два варыянты забойства — адзін на паляванні, другі ў замку. Перасцярог Казіміра нейкі шпалернік, які абіваў шпалерамі замкавыя пакоі і знайшоў схаваную ў фрамугах зброю. Падслухаўшы гутарку змоўнікаў, ён пераказаў усё пачутае князю Казіміру. Пачалі сачыць, упэўніліся, і Міхаіл Слуцкі з Іванам Гальшанскім былі схоплены. Фёдару Бельскаму пашанцавала ўцячы ў Маскву да Івана III. Але ў Вялікім княстве засталася яго жонка, з якой ён прабыў пасля вянчання адну ноч. Тры месяцы працягвалася следства. Высветлілася, што акрамя рэлігійных пачуццяў Міхаілам Слуцкім рухала асабістая крыўда на Казіміра. У 1480 годзе кіеўскім намеснікам прызначылі Івана Хадкевіча, хоць князь Міхаіл лічыў за сабой больш правоў на гэтую пасаду, бо Кіеўскае княства перад тым трымаў ягоны бацька. Прысуд вынеслі Слуцкаму і Гальшанскаму жорсткі — пакаранне

смерцю праз адсячэнне галавы, што і было споўнена ў Вільні пры вялікім натоўпе народу. Бе льскі ж назаўжды застаўся ў Маскве, дзе атрымаў уладанне. Жонку яго вялікі князь Казімір у Маскву не выпусціў, не згадзіўся на гэта потым і ягоны пераемнік, князь Аляксандр.

Пасля дваццаці гадоў дарэмнага чакання Бельскі ажаніўся з пляменніцай Івана III.

Тут варта адзначыць, што шчаслівы уцёк Бельскага меў месца праз год пасля вядомай бітвы на Угры, калі Маскоўская дзяржава канчаткова скінула татарскае ярмо і атрымала магчымасць вырашаць свае палітычныя задачы. Адной з іх была барацьба з Вялікім княствам Літоўскім за землі, узятыя Казімірам і яго папярэднікамі. Збеглы Бельскі не толькі выратаваў уласнае жыццё, але падаў і пэўны прыклад іншым князям, землі якіх суседнічалі з Маскоўскай Руссю. У 1487 годзе да Масквы далучыўся князь Іван Варатынскі, потым (разам з землямі) — князь Іван Бялеўскі, за ім — Дзмітрый Варатынскі. У 1492 годзе, адразу пасля смерці Казіміра, маскоўскае войска спаліла блізкія да памежжа гарады Мцэнск, Любутск, Масольск, заняло некалькі валасцей. Потым у Маскву адступілі князі Міхаіл Мядзецкі і Андрэй Вяземскі.

Выбухнула вайна, для Вялікага княства ве льмі няўдалая; па мірнай дамове да Масквы адышлі ўсе вотчыны князёў Навасільскіх, Адоеўскіх, Вяземскіх, Перамышльскіх, Бялеўскіх, горад Казельск. Пагадненне замацавалі шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой маскоўскага князя Івана III Аленай. Але дарэмна Аляксандр разлічваў атрымаць мір праз сваяцтва з Масквой. Зачэпкай для ваенных дзеянняў станавілася ўсё, што можна было скарыстаць у гэтых мэтах: нежаданне Аляксандра называць Івана «царом», ці непрызнанне з боку дыпламатыі Вялікага княства правамоцтваў Івана ўводзіць у свой тытул шматзначныя і пагрозлівыя словы «Всея Руси», ці уніяцкія тэндэнцыі, якія маскоўскі вялікі князь трактаваў як уціск на праваслаўную веру сваёй дачкі Алены. У ліпені 1500 года маскоўскае войска рушыла на землі Вялікага княства і паблізу Дарагабужа, на рэчцы Вядрошы, нанесла паражэнне

літвінам. Перамога рускіх была значнай, у палон трапіла шмат знакамітых літвінаў, і сярод іх гетман Вялікага княства Літоўскага Канстанцін Астрожкі, адзін з самых вядомых палкаводцаў XVI стагоддзя. За наступныя некалькі гадоў да Масквы адышлі 20 гарадоў і 70 валасцей. Маскоўскаму князю сталі служыць Васіль Шчымячыч, які «адступіў» з гарадамі Рыльск і Ноўгарад-Северскі, і князь Сямён Мажайскі, што здаў Чарнігаў, Гомель, Любеч, Стараду6.

Сітуацыя ўскладнялася набегамі крымскіх татараў. Крымскае ханства, якое ўзнікла ў 1443 годзе пасля распаду Залатой Арды,— практыкавала паходы на Польшчу, Вялікае княства і рускія землі як надзейны сродак узбагачэння. У 1497 годзе татары абрабавалі Мазыршчыну, праз два гады спалілі Брэст, яшчэ годам пазней спустошылі Т ураўскую зямлю. Летам 1502 года яны грабілі прыпяцкія землі; войска, якое ўзначаліў князь Сямён Слуцкі, і гусары Вялікага княства разбілі татараў на Ушы за Бабруйскам. У жніўні таго ж года царэвіч Баты-Гірэй захапіў пасады Слуцка, але замак узяць не здолеў. Былі абрабаваны таксама Капыль, Койданава, Нясвіж, Клецк. Наступным летам татарскія загоны зноў палілі Нясвіж, Клецк, Слуцк, Наваградак. Асобныя атрады крымчакоў хадзілі на Менск, Лагойск, дасягалі Віцебска, Полацка, Вільні. Толькі ў палон яны ўзялі больш за 100 тысяч беларусаў. Слуцкая княгіня Анастасія, жонка Сямёна Міхайлавіча, сама ўзначальвала абарону горада і, апрануўшы даспехі, вывела полк супраць татараў у поле. Потым князь Сямён дагнаў крымчакоў каля Давыд-Гарадка і разграміў.

Праз год татары зноў вогненным смерчам пранесліся па Беларусі, на гэты раз беспакарана. Калі ж яны з'явіліся ў 1506 годзе, тут ужо ім не пашанцавала. Вось як паведамляе пра гэта летапісец: «...Татарове у землю Литовскую вторгнули, против которых за намовою Михаила Глинского сам король Аляксандр велми хорым рушылся з Вилии до Лиды и оттуль з Лиды для хоробы своее далеи ехати не могучы, противку Татар отправил воиско Литовское, а над ними гэтманом Станислава Кишку, которыи гэтман Кишка ве льми ся расхорэлся, иж для хоробы своее и на коня ехати не мог. И поручивши врад свои гэтманскии Михаилу Глинскому, все воиско Литовское противку татар

выправил. А Татарове у Клецку кошом стояли, и там же под Клецком над Цэпрою была битва Литве с Татары у Спасов пост. И помог Бог Литве, иж Татаров на голову побили, а иншые, которые втекали, много их в рэцэ потонуло». Трэба адзначыць, што татараў было пад Клецкам 7 тысяч, Глінскі меў 5-тысячнае войска. Гналі ворага ад Клецка дваццаць вёрст, усе палі аж да вытоку Лані былі засланыя пабітымі крымчакамі. Пераможцы ўзялі 30 тысяч коней, вызвалілі з палону 40 тысяч чалавек.

Хутка пасля той перамогі сканаў вялікі князь Аляксандр. Пахавалі яго ў Вільні, у сутарэннях кафедральнага касцёла св. Станіслава. Дарэчы, да нядаўняга часу ў гэтым будынку месцілася нацыянальная мастацкая галерэя Літвы. Пад канец 1988 года урад Літоўскай рэспублікі па жаданні народа вярнуў старажытнае культавае збудаванне, самае старое і шануемае на Літве, царкве. Адной з падстаў такога стаўлення да касцёла св. Станіслава, апроч рэлігійных, было і ёсць тое, што ў яго падзямеллі знаходзіцца пантэон выдатных дзеячаў літоўскай і беларускай гісторыі і культуры. Шэсць стагоддзяў у сутарэнні не пападалі промні сонца, тут запалены чырвоныя лампадкі, іх цьмяныя агеньчыкі ледзь высвятляюць з цемры надмагільныя камяні вялікіх князё у Вітаўта і Свідрыгайлы, славутых палкаводцаў і асве тнікаў. У скле п вядуць вузкія каменныя сходы, і кожны можа спусціцца па іх, каб у непарушнай цішыні аддаць павагу тым, хто ўшанаваны надпісам на камяні, і засмуціцца сэрцам, што няма ў пантэоне многіх тых, хто не ме ней заслужыў перад народам і чые магілы лёс раскідаў па ўсім свеце.

Пасля Аляксандра ўжо нікога з вялікіх князёў не хавалі ў Вільні, таму і гэтае месца вечнага спачынку сведчыць пра пэўныя перамены ў гістарычным развіцці Вялікага княства Літоўскага.

Калі Жыгімонт пасля пахавання брата выйшаў з касцёла ўжо вялікім князем, дык наўрад ці ён адчуваў шчасце ад таго, што нарэшце займае трон. Яму споўнілася сорак тры гады, у такім веку многія вялікія князі і каралі ўжо сыходзілі з жыцця. Краіну моцна спустошвалі татарскія напады і войны з

Масквой, дзяржаўныя справы былі ў стане занядбаласці. На гасцінцах панавалі зладзеі, нават шмат хто з шляхты паляпшаў свой дабра быт, рабуючы падарожнікаў. Дайшло да таго, што ездзіць з якога недалёкага павета ў Вільню зрабілася небяспечным. Паны сталі надзвычай самастойнымі, шляхта патрабавала абароны князем яе правоў, даходы вялікакняжай скарбніцы з кожным годам меншыліся. Дваццаць шэсць князёў і радных паноў мелі ў сваім валоданні трацяк сялянскіх двароў. Змагаліся паміж сабой панскія групоўкі. Да таго ж няўдача пад Клецкам не спыніла татарскага нашэсця. У 1508 годзе крымчакі зноў з'явіліся на Беларусі, але былі разгромленыя каля Слуцка. Яшчэ праз два гады нечаканы напад дазволіў ім падысці да Вільні і разрабаваць яе наваколле. Па сутнасці набегі татараў на Беларусь спыніліся толькі ў 1526 годзе, калі князь Канстанцін Астрожскі дашчэнту разбіў іх 20-тысячнае войска. Каб утаймаваць агрэсіўнасць крымскіх ханаў, ад іх адкупліваліся, для насе льніцтва ўводзіўся спецыяльны падатак — ардыншчына. Вось як яна выглядала па тагачасных дакументах: «Смаленск — 2 сарока сабалёў, 2 паставы махальскіх, 2 паставы трыцкіх, 2 навагонскіх. Віцебск — сорак сабалёў, пастаў махальскі, 2 паставы трыцкіх. Менск — сорак сабалёў, пастаў лунскі, пастаў махальскі, 2 паставы трыцкіх... Брэст — пастаў махальскі а пастаў трыцкі... Вільно — 3 сарока сабалё ў, пастаў лунскі, пастаў махальскі, 3 паставы трыцкіх...” (Няма чаго здзіўляцца, што собаль знік з нашых лясоў.)

Адначасна з татарскім нашэсцем вяліся руска-літоўскія войны на ўсходніх рубяжах. Немалую шкоду прынёс гаспадарству мяцеж Міхаіла Глінскага, справакаваны, трэба мо віць, няўдзячнымі адносінамі да апошняга з боку вялікага князя Жыгімонта. Глінскі паходзіў з роду хана Мамая, сын якога Мансур Кілат пасля паражэння бацькі на Куліковым полі ўцёк у Вялікае княства і атрымаў горад Глінск над Сулай (адсюль і прозвішча Глінскія). Сын Мансура Кілата прыняў праваслаўе, і сам Міхаіл Глінскі быў хрышчаны ў царкве. Па звычаях веку ён вучыўся ў Італіі, і там прыняў каталіцтва. Потым дванаццаць гадоў прысвяціў ваеннай службе ў Германіі і Іспаніі, жыў пры двары імператара Максіміліяна. Князь Аляксандр высока цаніў розум і здольнасці Глінскага,

зрабіў яго сваім першым дарадчыкам. Глінскі ме ўся праводзіць рэарганізацыю войска, стварыў першыя ў Вялікім княстве гусарскія эскадроны. У 1501 годзе ён пазнаёміўся з каралевічам Жыгімонтам і шмат зрабіў, каб забяспечыць апошняму бацькоўскі трон. Але варожыя Глінскаму князі і паны скарысталі сітуацыю і здолелі заразіць Жыгімонта недаверам да Глінскага, з чаго ў хуткім часе паўстала паміж імі варожасць. Жыгімонт не зацвердзіў яго на пасадзе дворнага маршалка і пакрыўдзіў, калі перавёў роднага брата Глінскага з Кіеўскага княства на Наваградскае ваяводства.

Галоўным ворагам Глінскага быў Ян Забярэзінскі. Глінскі сабраў харугву ў 800 вершнікаў і рушыў пад Гродна. Па дарозе пасватаўся да слуцкай княгіні Анастасіі, удавы Сямёна Міхайлавіча. Тая адмовіла, і Глінскі папаліў Слуцк, як два гады назад тое ж зрабілі татары. Пра далейшыя падзеі яскрава сведчаць нататкі храніста: «...князь Михайло Глинскии Заберезинского забил таким способом, иж виде л Глинский, же был от всих опущон, с тое неласки королевское маючы сэрцэ скрвавенае против Янови Заберезинскому, розумеючы то з его прычыны быти. Скоро король выехал з Литвы насэнм до Петрыкова, зостал в Литве угледевшы свои час, съехал на Яна Заберезинского, маршалка великого, до двора его, которыа есть через рэку от места Городна концу моста, о першон годнне в ноч взял его з ложа у одной кошули и казал стяти Турчыну, своему слузе, голову его, через место Городно на древцу нести казал потом у озеро в колку милях укинено. Розумел тому Глинскии, иж порушыл короля и паны Литовскии, приятели небожчыковы, против собе...»

Так, разумеў Глінскі, што гэты ўчынак яму не даруюць. Ен вярнуўся ў Тураў, якім валодаў, і тут прыйшла да яго прапанова ад князя Васіля ад'ехаць у Маскву. Глінскі згадзіўся. Першым дзеяннем здрады стаў захоп Мазыра, дзе ён прынёс прысягу вялікаму маскоўскаму князю. Але вайсковай дапамогі ў той час Глінскі ад Масквы не атрымаў і мусіў уцякаць. У 1512 годзе пачалася вайна паміж Васілём і Жыгімонтам. Маскоўскае войска аблажыла Смаленск, і Глінскі спрыяў таму, што горад быў здадзены рускім. Аднак стасункі яго з маскоўскім князе м Васілём складваліся, відаць, не зусім так, як яму хацелася, ды і цвёрдая

цэнтралізацыя, характэрная для Маскоўскай Русі, мусіць, раздражняла бурлівую, вольную натуру князя Глінскага. У 1514 годзе, напярэдадні новай вайны Масквы з Вялікім княствам, ён увайшоў у тайную перапіску з Жыгімонтам, агаворваючы ўмовы, на якіх вернецца на радзіму. Але пасланца ягонага схапілі, намер Глінскага стаў вядомы, і князя кінулі ў астрог.

8 верасня 1514 года 30-тысячнае беларуска-літоўскае войска, якое ўзначальваў гетман Канстанцін Астрожскі, нанесла паражэнне пад Оршай 80-тысячнаму маскоўскаму войску. Гэтая вялікая няўдача князя Васіля адбілася і на лёсе Міхаіла Глінскага. Пераможцу ў бітве пад Оршай у 1507 годзе князю Астрожскаму пашчасціла вырвацца з маскоўскага палону, праўда, праз парушэнне дадзенай прысягі. Глінскаму ж пагражала пакаранне смерцю, але ён здолеў адшукаць выйсце з цяжкага становішча. Князь выказаў намер вярнуцца ў праваслаўе. Настаўляў яго ў веры мітрапаліт Варлаам. Жыццё сабе Глінскі выратаваў, але вольны свет убачыў толькі ў 1526 годзе. Дарага каштавалі яму галава Забярэзінскага і ўцёкі ў Маскву.

Вынікам перамогі пад Оршай было замірэнне Вялікага княства з Маскоўскай Руссю, але не трывалае. Руска-літоўскія войны працягваліся амаль усё XVI стагоддзе, не скончыліся яны і ў наступным. Пастаянная і напружаная барацьба з крымчакамі і рускай дзяржавай стрымлівала сацыяльнае і культурнае развіццё Вялікага княства, бо патрабавала вялікіх сродкаў, не кажучы ўжо аб стратах людзей і разбурэннях. Пасля няўдачы на Ведрашы, дзе выявіліся недахопы паспалітага рушэння, былі праведзены некаторыя вайсковыя рэформы. У практыку ўвайшлі «попісы» служылых людзей, а ў войску з'явіліся наёмнікі. Жыгімонт давёў колькасць апошніх да пяці тысяч. Апроч ардыншчыны з насельніцтва пачалі збіраць падаткі на ўтрыманне рэгулярнага войска. Узмацніліся і дзяржаўныя патрабаванні да вайсковай павіннасці. Заканадаўча зацвярджалася, што той, хто ў вызначаны тэрмін не з'явіцца на месца збору войска, падлягае штрафу ў сто рублёў. Спазненне на тыдзень, самавольны адыход з войска пад час вайны цягне за сабой пакаранне смерцю. У 1522 годзе Гарадзенскі сейм пастанавіў адымаць вотчыну ці

уладанне ў тых паноў і шляхты, якія парушаюць вайсковую дысцыпліну.

Ваенная напружанасць прыводзіла, з аднаго боку, да мілітарызацыі свядомасці, з другога — стварала падставы для паланізацыі, захавання канфедэрацыі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў сувязі са знешняй небяспекай. За выключэннем невялічкага перыяду (дзесяцігоддзе з 1492 па 1501 год), калі кожная з дзяржаў мела свайго гаспадара, усе XV і XVI стагоддзі вялікі князь літоўскі быў адначасна і каралём польскім. Наўмысна ці выпадкова галоўным дваром зрабіўся кракаўскі, а гэта прымушала літоўскае, беларускае, украінскае панства да карыстання польскай мовай. Аляксандр і Жыгімонт Стары атрымалі каталіцкае выхаванне, зразумела, што з большай прыязнасцю яны ставіліся да каталікоў. Нават такі шчыры абаронца праваслаўя, як князь Канстанцін Астрожскі, пісаў свае лісты па-польску. Уплывовы ў той час праваслаўны баярын Іван Сапега, дзяк вялікакняжацкай канцылярыі, не йкім чынам дамогся ад рымскага папы прывілея, які дазваляў у праваслаўнай царкве, прыналежнай Сапегам, служыць абедню як па грэчаскаму, так і па лацінскаму абрадам. Паступовы адыход ад праваслаўя заможных фамілій пазбаўляў яго магчымых фундатараў і мецэнатаў. Такім чынам, ужо на пачатку XVI стагоддзя культурная сітуацыя ў Вялікім княстве складвалася не на карысць праваслаўнай традыцыі. Да таго ж не абходную вышэйшую адукацыю большасць здольных да навукі ўраджэнцаў Літвы і Беларусі магла атрымаць у Кракаўскім універсітэце, які апекавала каталіцкая царква. Юнакі з заможных сем'яў наогул вучыліся ва універсітэтах Заходняй Еўропы і, безумоўна, па вяртанні адчувалі значную адсталасць «рускай» кніжнай і навуковай культуры, не кажучы ўжо пра культуру палітычную.

І вось на фоне такіх падзей і абставін распачалася асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны. Ен надрукаваў першую кніжку, калі яму было 35 гадоў. Праўда, у нашай папулярнай літаратуры беларускі першадрукар добра амаладжаны — на восем гадоў. Так падае нават энцыклапедычны даведнік, дзе гаворыцца, што Францыск Скарына нарадзіўся ў 1490 годзе, у 1504-ым запісаны ў Кракаўскі універсітэт, праз два гады атрымаў там ступень

бакалаўра, а яшчэ праз шэсць стаў доктарам медыцыны. Гэта значыць, у 22 гады. Адпаведна ў 27 гадоў пачаў друкаваць пераклад Бібліі. Вельмі прыгожа, але, на жаль, далёка ад праўды... Даследчык Генадзь Лебедзеў, абапіраючыся на працы польскіх і чэшскіх вучоных, крытыкуе гэтыя легкаважныя міфы.

Нарадзіўся Скарына каля 1482 года; калі пачаў вучыцца ў Кракаўскай акадэміі — невядома, бо той запіс, на які звыкліся спасылацца («Францыск (сын) Лукі з П(о)лацка»), мае адносіны не да Францыска Скарыны, а да нейкага Францыска з польскага горада Плоцка. Актавы ж запіс ад 1506 года сведчыць, што «Францыск з Полацка, літвін» атрымаў ступень бакалаўра свабодных мастацтваў. Пасля таго яшчэ пяць гадоў ён вучыўся ў Кракаве на факультэце медыцыны, а ступень доктара медыцыны абараняў у Падуанскім універсітэце, які меў дастатковую колькасць спецыялістаў, каб абарону зацвердзіць. Праз пяць гадоў пасля гэтага Скарына асеў у Празе, дзе выдаў 22 кнігі са складу Бібліі.

Францыск Скарына, безумоўна, быў усходнеславянскім першадрукаром. Аднак пачатак кірылічнаму кнігавыданню паклаў немец Швайпольт Фіёль, які ў 1491-1493 гадах у Кракаве выпусціў чатыры кнігі «рускім шрыфтом» — «Актоіх», «Часаслоў», «Трыёдзь посную» і «Трыёдзь каляровую». Арыгіналам Фіёлю, як устанавілі даследчыкі, служылі маскоўскія рукапісы. Шрыфты вырэзваў студэнт Рудольф Борсдорф. Кнігі надрукаваны на царкоўнаславянскай мове і з'яўляюцца інкунабуламі.

Інкунабуламі называюць кнігі, што выдадзены да 1501 года. Кнігадрукаванне, як вядома, пачалося ў 1444 годзе. Прыкладна за першае паўстагоддзе існавання еўрапейскай друкарскай справы чытачы краін Заходняй Еўропы атрымалі болей за 40 тысяч назваў агульным тыражом 10 мільёнаў экземпляраў. Толькі ў Венецыі дзейнічалі 150 друкарань; яны зафіксаваны на той час у 260 гарадах Заходняй Еўропы. Так што, калі Скарына вучыўся ў Крака ўскай акадэміі, кніга ўжо была нармальнай з'явай жыцця, і бібліятэкі маглі прапанаваць шырокі выбар як духоўнай, так і свецкай, навучальнай

літаратуры.

Другая друкарня, якая карысталася кірылічным шрыфтам, існавала ў сталіцы чарнагорскіх валадароў Црноевічаў. Захоп Чарнагорыі туркамі ў 1499 годзе спыніў тут кнігавыдавецкую справу. Але некалькі кніг усё ж выйшла, і Скарьша, безумоўна, з імі знаёміўся.

Выданне кнігі, нетаннае і сёння, у тыя часы тым больш было справай няпростай, патрабавала вялікіх выдаткаў на паперу, станкі, шрыфты, фарбы, аплату друкароў. Мецэнатамі Скарыны выступалі Багдан Он каў, Якуб Бабіч, князь Канстанцін Астрожскі. Відаць, дапамог сродкамі і брат Іван. Усе яны, дарэчы, рызыкавалі, бо Скарына з'яўляўся рэфарматарам. Ен зрабіў пераклад Бібліі на зразумелую «люду паспалітаму» мову, што, безумоўна, сапраўдны культурны подзвіг; парушыў шматвяковую традыцыю выкарыстання канфесіянальнай, царкоўнаславянскай мовы з яе зкамянелымі формамі; ужыў лексіку і граматычныя формы жывой беларускай мовы. Падхопленая і развітая паслядоўнікамі Францыска Скарыны, гэтая тэндэнцыя прывяла да таго, што на беларускай мове з цягам часу сталі весціся набажэнствы ва уніяцкай і праваслаўнай цэрквах на Беларусі. Пражскія выданні, калі ме ркаваць з таго, што яны друкаваліся адно за адным, мелі добры попыт. Можа, Скарына і ягоныя прыхільнікі не дужа разбагацелі, але і не збяднелі. Гэты практычны момант нельга не браць пад увагу, бо ў рэальным жыцці чалавек заўжды жадае звязаць прыемнае з карысным. Скарына не быў настолькі заможным, каб не думаць пра грошы. Яны давалі магчымасць друкаваць кнігі Бібліі, вызвалялі час для перакладаў, наогул, рабілі незалежным ад службы.

У 1520 годзе Скарына з нейкай нагоды перабіраецца ў Вільню. Што падштурхнула яго на такі крок, ніхто не ведае, таму і нам не варта гадаць. Тут ён працягвае кнігавыдавецкую дзейнасць, але яна ўжо не была такой бурлівай, як у Празе. У Вільні пабачылі свет дзве кнігі — «Малая падарожная кніжка» і «Апостал». У адрозненне ад пражскіх віленскія старадрукі выдадзены на царкоўнаславянскай мове ў бе ларускай рэдакцыі. Пэўна, пакупнікоў на іх

аказалася менш, чым меркавалі Скарына і кола людзей, якія фінансавалі выданні і здзяйснялі іх продаж. Кніга наогул каштавала дорага, часам як дваццаць трыццаць кароў; набыць выданне мог толькі заможны чалавек, таму галоўнымі пакупнікамі выступалі царква, манастыры, багатая шляхта, суполкі гараджан. Спроба збываць кнігі ў Маскоўскай дзяржаве не ме ла поспеху, маскоўскія адказныя духоў ныя асобы бачылі ў іх ерась — па-першае, моўную, паколькі праваслаўная царква ў Маскоўскай Русі зацята трымалася царкоўнаславянскай мовы; па-другое, Скарына насыціў свае выданні свецкімі звесткамі, што артадаксальнае мысленне не магло ўспрыняць інакш, як здзеклівы гвалт над святыняй. Захаваўся даку мент ад 1552 года — інструкцыя Жыгімонта Аўгуста свайму паслу А. Крычку ў Рыме, пры папскім двары, зме ст якой датычыцца знішчэння друкаванай «Бібліі» ў Маскве:

«Гэта добра ведалі папы Аляксандр IV і Леў X, таму, калі Васіль III, бацька таго, хто зараз кіруе маскавіцянамі, таксама як цяпе р гэты (мае цца на ўвазе Іван Грозны.— К. Т.), але з яшчэ большай упартасцю і ў больш сталым узросце з наме рам адправіўшы ў Рым бліскучае пасольства, дамагаўся ад іх кароны (і шмат паабяцаў ім, і гэтак жа спрыялі яму кароль Максіміліян і некаторыя іншыя хрысціянскія князі), аднак нічога не атрымаў. Таму што, апрача лжывых абяцанняў, яны не выявілі ні ў яго, ні ў каго іншага з маскавіцян ніякіх прыкмет прыхільнасці да каталіцкай рымскай царквы, і нават калі пры панаванні нашага боскага бацькі (Жыгімонта I) нейкі яго падданы, кіруючыся набожным жаданнем і вырашыўшы надрукаваць і выдаць на рускай мове Святое Пісанне, прыбыў да маскавіцян, гэтыя кнігі былі публічна па загаду князя спалены, таму што былі выдадзены падданым рымскай царквы і ў месцах, якія падлягаюць яе ўладзе. Такая ўселеная ў гэты народ непрыязнасць да лацінскага і рымскага імені...»

Есць ускосныя зве сткі, што і сам Скарына ездзіў у Маскву з нагоды продажу сваіх выданняў, аднак быў арыштаваны і ледзь выратаваўся. Пто б там ні сталася, але шырокага попыту віле нскія кнігі на Маскоўскай Русі не атрымалі. Не нашмат лепш, відаць, ішлі справы з кніжным гандлем на Беларусі і Украіне, бо друкарскі станок у камяніцы, аддадзенай Якубам Бабічам пад

друкарню, з 1525 года заціх. У тым годзе памёр Юры Адвернік, адзін з фундатараў кнігавыдавецкай дзейнасці Скарыны ў Вільні, і Францыск (на той час меў сорак тры гады) ажаніўся з яго ўдавой, Маргарытай. Сямейнае жыццё Скарыны — будзе м думаць, шчаслівае — цягнулася чатыры гады. Маргарыта сканала ў 1529 годзе, пакінуўшы на руках мужа немаўля. Да тужлівай адзіноты дадалося сумнае ўсведамленне малой зацікаўленасці яго выдавецкай справай з боку адукаваных колаў насельніцтва Вялікага княства. Ды і само гэтае кола было яшчэ занадта вузкім. Каталіцкая царква друкарскую дзейнасць Скарыны сустрэла непрыязна. Не падтрымалі яго ініцыятывы і праваслаўныя светары, што змагаліся супраць рэфармацыйных павеваў, а праца першадрукара, безумоўна, мела на сабе адбітак такіх ідэй. Друкарні, якая б выдавала кнігі лацінкай, Вялікае княства не мела. Але паслугамі Скарыны віленскі каталіцкі капітул не карыстаўся, хоць Францыск быў католікам і служыў сакратаром і прыдворным лекарам у біскупа віленскага Яна, пазашлюбнага сына Жыгімонта Старога. Сапраўды, цяжка стаць прарокам у сваёй Айчыне. Бяздзейнасць праваслаўнай царквы ў Вялікім княстве, яе арыентаванасць на старадаўнюю традыцыю, сляпое і не разумнае супрацьстаянне «лацінянам» нават у адносінах адукацыі, асветы, падрыхтоўкі ўласных святароў, балюча адгукнуліся ёй у недалёкай будучыні. Мусіць, калі б сярод тагачасных дзеячаў праваслаўя ў Вялікім княстве знайшліся разумныя людзі, здольныя ўбачыць той духоўны плён, які можа даць друкаваная кірыліцай кніга, дык не было б такога працяглага перапынку ў беларускім кнігавыданні, якое ўзнавілася пасля Францыска Скарыны толькі гадоў праз трыццаць, ужо ў адказ на кніжную ручаіну з каталіцкіх і пратэстанцкіх друкарань. Гэтая няўвага сучаснікаў не магла не выклікаць у Скарыны пачуцця горычы.

Да шматлікіх расчараванняў і няўдач дадаліся смерці аднадумцаў. Не стала віленскага бурмістра Якуба Бабіча. Памёр фундатар віленскай друкарні Багдан Онкаў. У 1530 годзе пакінуў белы свет Канстанцін Астрожскі, адзіны праваслаўны князь на Літве, які атрымаў пасаду троцкага ваяводы, што супярэчыла артыкулам Гарадзельскай уніі. У адпаведнасці з тэстаментам яго

пахавалі ў Кіева-Пячорскай лаўры. Астрожкі быў буйнейшым землеўладальнікам у Вялікім княстве, валодаў сарака тысячамі душ. Яго падтрымка праваслаўя мела пэўныя межы і наяўныя супярэчнасці. Астрожскі стаяў за пагадненне з Польшчай, бо, па яго меркаваннях, Вялікае княства само па сабе не магло супрацьстаяць Маскоўскай Русі. З гэтай прычыны ён варагаваў з Гаштольдамі, якія схіляліся да ідэі літоўскага сепаратызму. Але цесны саюз з Польшчай і роўнасць праваслаўнай царквы з каталіцкай, роўнасць культур і моў, як паказала жыццё, былі несумяшчальнымі з'явамі. Так што на той час Францыск Скарына застаўся без жонкі, сяброў, фундатараў, друкарні.

У 1525 годзе апошні магістр Тэўтонскага ордэна Альбрэхт Брандэнбургскі (пляменнік вялікага князя Жыгімонта) правёў секулярызацыю Ордэна і абвясціў замест яго свецкае Прускае герцагства. Захоплены пратэстанцкім рухам магістр распачаў у Прусіі рэфарматарскія перамены, якія ў першую чаргу датычыліся царквы і школы. Для кнігавыдавецкай справы Альбрэхт запрасіў у Кёнігсберг Францыска Скарыну. Той прыехаў, спадабаўся герцагу, уразіў яго адукаванасцю, але надоўга там не затрымаўся. Праз некалькі месяцаў вярнуўся ў Вільню, спакусіўшы на выезд з Кёнігсберга разам з сабой двух спецыялістаў — лекара і друкара. Гэты ўчынак вельмі абразіў герцага Альбрэхта, і ён накіраваў ліст да віленскага ваяводы Гаштольда, дзе скардзіўся, што Скарына «зводніцкім нагаворам» пазбавіў горад друкара, а шматлікіх хворых — лекара, і прасіў вярнуць гэтых людзей герцагству. З якой мэтай Скарына забраў у Вільню лекара і друкара, застаецца нераскрытым. Магчыма, ён усё ж такі песціў яшчэ спадзею на працяг друкарскай дзейнасці.

Наступныя гады зноў прынеслі Скарыне няшчасце. Памёр брат Іван, ягоныя даўгі крэдыторы выра шылі спагнаць з Францыска і звярнуліся са скаргай да караля Жыгімонта. Тры месяцы Скарына адседзеў у Познаньскай турме, пакуль пляменнік Раман не дамогся сустрэчы з каралём, якому растлумачыў справу. Дзякуючы гэтаму з'явілася на свет прывілейная грамата, дзе былі адзначаны хітрыкі крэдытораў, а віна Скарыны адмаўлялася; яму

вярнулі волю. Неўзабаве пасля той «прыгоды» Францыск Скарына выехаў у Прагу. Распаўсюджаная легенда, быццам ён займаў там пасаду каралеўскага садоўніка па запрашэнні караля Фердынанда і заснаваў славуты сад на Градчанах, не мае пад сабой грунтоўных падстаў. Чэшскія дасле дчыкі трымаюцца думкі, што «сад на Градзе» быў заложаны запрошанымі італьянцамі Джавані Спацыа і Франчэскам Банафардэ. Падобнасць імёнаў — Франчэска — Францыск — вось тое адзінае, з чаго нарадзілася версія пра садоўніцкую дзейнасць Скарыны. Чым займаўся Скарына ў Празе — застаецца невядомым. Хутчэй за ўсё, практыкаваў як лекар. Сканаў беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар у 1551 годзе ў сямідзесяцігадовым узросце на братняй чэшскай зямлі, дзе здзейсніў асветніцкі подзвіг, падараваўшы свайму народу друкаваную кнігу. Пакінуў Скарына сваім паслядоўнікам не толькі 25 кніг з Бібліі; яго шрыфты і гравіраваныя застаўкі з віле нскай друкарні выкарыстоўваліся кнігавыдаўцамі яшчэ сто гадоў.

Акадэмік Я. Карскі ахарактарызаваў беларускага гуманіста Францыска такімі словамі: «Мы маем у асобе Скарыны адукаванейшага чалавека свайго часу, які ніколькі не саступаў тагачасным заходнееўрапейскім дзеячам ні па свайму розуму, ні па энергіі, ні па сваіх высокіх задумах... Скарына прысвяціў лепшыя гады жыцця асвеце сваіх землякоў. Выклікае здзіўленне, акрамя моцнай энергіі, імкненне да асветы, выключная бескарыслівасць і самаахвярнасць слаўнага доктара з Полацку». Імя Францыска Скарыны даследчыкі знітоўваюць і з распрацоўкай Першага Статута Вялі кага княства Літоўскага, уведзенага ва ўжытак у верасні 1529 года. Сапраўды, як сакратар віленскага біскупа, чалавек высокаадукаваны, знаўца права і некалькіх моў, Скарына мог быць сярод тых людзей, што вырашылі адысці ад рымскага права, якім традыцыйна карысталіся еўрапейскія краіны, і стварыць звод законаў, набліжаных да юрыдычнай рэальнасці Вялікага княства. Статут складаўся з тузіна раздзелаў, дзе змяшчаліся асноўныя нормы дзяржаўнага права, шлюбна-сямейнае, спадчыннае, працэсуальнае, крымінальнае, зямельнае, грамадзянскае. Згодна з законам гаспадар быў абавязаны захоўваць

тэрытарыяльную цэласнасць Вялікага княства, не дапускаць на дзяржаўныя пасады ў Беларусь і Літву чужаземцаў, не аддаваць ім маёнткі, прытрымлівацца старых звычаяў. Статут абвяшчаў прынцып публічнасці правасуддзя, права на абарону з удзелам адваката. Выхад гэтага дакумента адыграў значную ролю ў развіцці права. Статут стаў першым зборам законаў у феадальнай Еўропе, своеасаблівым узорам для пераймання, бо стваральнікі яго паклалі ў аснову новыя прынцыпы — сувярэннасці дзяржавы, прыярытэту пісанага права перад «старым обычаем».

Распрацоўка і прыняцце Статута былі б немагчымы без зацікаўленай падтрымкі з боку вялікага князя Жыгімонта Старога, а ён знаходзіўся пад моцным уплывам сваёй жонкі, каралевы Боны. (На час жаніцьбы Жыгімонт меў пяцьдзесят гадоў, Бона — дваццаць два.) Яна паходзіла з вядомага італьянскага роду Сфорца і вылучалася выдатнымі практычнымі здольнасцямі. Пасля нілюбу карале ва атрымала ў асабістае ўладанне Пінскае і Кобрынскае княствы і хутка пачала скупаць землі, каб павялічыць вялікакняжацкі надзел і адпаве дна свае даходы. Так Боне дасталася вялікая частка пушчы, што цягнулася ад Гродна да Коўна. У 1533 годзе яна выкупіла ў Юрыя Радзівіла гродзенскае староства, набыла землі ў Клецкім і Гродзенскім паветах. На сваіх землях каралева ажыццявіла прагрэсіўную валочную рэформу, перабудавала вёскі, упарадкавала падаткі. Гэта дало ёй магчымасць атрымоўваць штогод толькі на Беларусі 36 тысяч злотых. Пасля смерці Жыгімонта Старога Бона ад'ехала ў Італію і вывезла з сабой вялікі скарб. Шмат намаганняў яна прыклала, каб забяспечыць абранне на вялікакняжацкі і каралеўскі трон свайго сына Жыгімонта Аўгуста. Т ую валочную рэформу, што пачала маці, Жыгімонт Аўгуст давёў да канца. Пры ім быў здзейснены другі «Попіс» войска Літоўскага.

Як і дзе гэта адбывалася, дае ўяўленне даведка ад 10 мая 1567 года. Есць сэнс яе працытаваць: «Попис войска. земского Вел. кн. Лит., которые збиралися за уфалою сойму Городенского на местцо, через листы короля его мости назначоное, к Молодечну; которому збиранью час был од короля его мости зложон на 7-ю суботу недавно прошлую. А почали збирати и

подписывати в Красном Селе перед его мости паном гетманом, паном Григорьем Але ксандровиче м Ходке вича, паном виленским, гетманом наивышшым Вел. кн. Лит.». Сышліся на «местцо назначоное» 27 780 конных і 7200 пешых ваяроў. Мястэчка Краснае і сёння раскінулася там, дзе стаяла ў XVI стагоддзі, недалёка ад Маладзечна. Калі прыехаць сюды, падняцца на пагорак і даць волю ўяўленню, дык убачацца і тыя конныя, і пешыя паны, шляхта, драбы, шматлікія агні, дзесяткі тысяч коней на пожнях. Розную сілу мелі тагачасныя паветы. Шляхта Лідскага павета выстаўляла 800 ве ршнікаў, Менскі павет — 220, Наваградскі — 450, Брэсцкі — 420, Пінскі — 234, Гродзенскі — 714. Праходзілі перад гетманам і запісваліся татарскія харугвы: Магмета Юхновіча ў 147 коней, Магмета Якубовіча ў 85, Мортуза Алішкевіча ў 50, Абдрахмана Войніча ў 53 кані і інш. Побач з князем Радзівілам, які адзін выстаўляў 540 вершнікаў, стаяла шляхта, што не мела коней; такіх шляхцічаў адзначана ў «попісу» 1518 чалавек. Можа ім і не надта хацелася ісці пад Маладзечна на «попіс», паказвацца беднасцю, ды патрабаваў закон — за год да гэтага быў прыняты Другі Статут, і ўжо стваралася камісія для падтыхтоўкі чарговага, новага.

Узначалілі камісію выдатныя дзяржаўныя дзеячы — Астафі Багданавіч Валовіч, канцле р вялікі літоўскі, і Ле ў Іванавіч Сапега, пісар вялікі літоўскі, а поты м падканцлер. Трэці Статут, 1588 года, аформіў захаванне Вялікага княства Літоўскага насуперак рашэнням і акту Люблінскай уніі, па якому яно павінна было зліцца з Польшчай у адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Аднак Беларусь і Літва дамагліся іншага — сумесна з Польшчай яны ўтварылі новую дзяржаву, у якой і Полыпча і Вялікае княства заставаліся самастойнымі гаспадарствамі з уласнымі тэрыторыямі, заканадаўствам, скарбніцамі і войскам. На рубяжы паміж імі па-ранейшаму бралася мыта (пошліна), толькі за ўраджэнцамі Вялікага княства захоўвалася права займаць дзяржаўныя і судовыя пасады.

Складальнікі не ўнеслі ў Статут ніводнай нормы, якая б магла быць выкарыстана супраць дзяржаўнай самастойнасці Вялікага княства Літоўскага.

Усюды падкрэслівалася яго адасобленасць. Галоўнай асобай ва ўсё й сістэме дзяржаўных органаў прызнаваўся вялікі князь. Пасля Люблінскай уніі вялікія князі літоўскія адначасна з'яўляліся каралямі Полыпчы і агульнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Аднак свае паўнамоцтвы вялікі князь выконваў не адзінаўладна, а з удзелам рады і сейма.

Трэці Статут быў напісаны на старабеларускай літаратурнай мове, грунтаваўся на беларускай прававой ле ксіцы. У Заходняй Еўропе юрысты карысталіся лацінскай мовай, а гэты звод законаў разумела ўсё жыхарства Вялікага княства. У якасці моўнага прыкладу варта прывесці тут невялічкі артыкул, які мае назву «Хто бы в голод челядь свою выгнал»:

«Теж уставуем, естли бы хто в голод челядь свою невольную выбил з дому прочь, не хотечи их кормити и переховывати и тая челядь сама себе у голод перекормила, таковые вжо не мають быти невольные але вольными, а ведь же тым обычаем, иж коли тую челядь вы6ъет, тогды они оповедатн то мають вряду к гродскому того пове ту або врядником местским бурмистром, або мегцаном, иж их выбил, а пан тое челяди не оповедает и не запишет не вряде утеченья их, то вжо тая челядь вольна маеть быти вечными часы».

Трэці Статут канчаткова замацаваў беларускую мову ў якасці афіцыйнай, дзяржаўнай мовы Вялікага княства; тыя ўрачыстыя словы, напісаныя Львом Сапегам і зацве рджаныя воляй се йма чатыры стагоддзі таму назад, нельга не прыгадаць: «...писар земский маеть по руску лите рами и словы рускими вси листы, выписы и позвы писати а не иншим езыком и словы». Можна зразумець гонар Сапегі, які пісаў у прадмове да Статута: «Не обчим яким языком, але своим власным права списаные маем и каждого часу чого нам потреба ку отпору всякое крывды ведати можем». Праца над Статутам І яго выданне ў віленскай друкарні Мамонічаў — вялікая заслуга Льва Сапегі перад нашай культурай і народам.

Трэці Статут Вялікага княства Літоўскага набыў шырокую еўрапейскую вядомасць. Ён перакладаўся на польскую, нямецкую, лацінскую, французскую

мовы, выкарыстоўваўся на Маскоўскай Русі пры падрыхтоўцы Сабornага ўлажэння 1649 года, у судах Эстоніі і Латвіі. Статуту было наканавана доўгае жыццё. Ен дзейнічаў усе XVII і XVIII стагоддзі, толькі ў 1840 годзе царскі загад скасаваў яго адначасна з афіцыйнай забаронай назваў «Беларусь» і «Літва», якія жорсткай фантазіяй рускага самадзержца ператварыліся ў «Паўночна-Заходні край» неабсяжнай імперыі.